*Л.Ю. КАЗАКОЎ*

# ПРЫВАТНАЎЛАСНІЦКІ МАЁНТАК У БЕЛАРУСИ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI - ПАЧАТКУ XVII ст. (ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД)

Проведен историографический обзор частновладельческого имения в Беларуси во второй половине XVI - начале XVII в. Проанализированы работы белорусских, польских и украинских ученых XIX-XX вв. по данной тематике, определены перспективы изучения проблемы.

This article gives a historiographical review of Belarusian private estate in the second half of XVI century - the beginning of XVII century. The author analyses the works of Belarusian, Polish and the Ukranian scientists on the topic and outlines the prospects for further investigation of the problem.

Другую палову XVI - першую палову XVII ст. можна назваць паваротным момантам у развіцці сярэднявечнай эканомікі беларускіх зямель. На змену старым формам гаспадарання прыходзіць новая сістэма землекарыстання (фальваркава-паншчынная), пабудаваная на працы цяглых сялян. Менавіта

ў гэты час яна пачынае складвацца і ўмацоўвацца на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Пра яе трываласць сведчыць той факт, што фальваркава-паншчынная сістэма праіснавала на Беларусі некалькі стагоддзяў (да пачатку XX ст.) і на працягу значнага прамежку часу з'яўлялася досыць эфектыўнай формай землеўпарадкавання. Вывучэнне станаўлення сярэднявечнай эканомікі Беларусі з'яўляецца надзвычай актуальным, бо дае нам магчымасць убачыць у новым святле і пераасэнсаваць тыя працэсы, якія адбываліся ў беларускай эканоміцы ў больш позні час, а таксама вызначыць аб'ектыўныя законы развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі. Гэтая праблема зацікавіла многіх беларускіх гісторыкаў, аднак і зараз некаторыя яе аспекты застаюцца нявысветленымі.

Упершыню праблема эвалюцыі землеўладання і землекарыстання на беларускіх землях у другой палове XVI - пачатку XVII ст. асвятляецца ў працах гісторыкаў канца XIX - пачатку XX ст. Варта адзначыць, што дадзеная праблематыка ўпамінаецца перш за ўсё з прычыны вывучэння сялянскага землеўладання на землях Вялікага княства Літоўскага ў адпаведнасці з нормамі Літоўскага права. Менавіта працы М.Ф. Уладзімірскага-Буданава[1] і Ф.І. Леантовіча[2] паклалі пачатак вывучэнню прыватнаўласніцкага маёнтка на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага ў азначаны перыяд. У працах Ф.І. Леантовіча змешчаны аналіз шляхецкага гаспадарчага двара як формы арганізацыі феадальнай гаспадаркі. Збольшага даследаванні прысвечаны аналізу юрыдычнага статуса двара. Так, даследчык лічыць, што шляхецкі двор адпавядае юрыдычнаму тэрміну curia, curiae і тым самым адносіцца да даўніх інстытутаў права. Што ж датычыцца функцый гаспадарчага двара ў разглядаемы перыяд, то ён бачыць яго як адміністрацыйны і гаспадарчы цэнтр кожнага панскага маёнтка, пры гэтым тэрміны «двор», «дворец», «маетность» і «маенток», якія сустракаюцца ў дакументах, з'яўляюцца ідэнтычнымі. Азначаныя навукоўцы не займаліся непасрэдна эканамічнай гісторыяй, яны аналізавалі эканамічныя з'явы, грунтуючыся на базе палітычнай гісторыі і гісторыі права, таму некаторыя іх тэзісы не зусім адпавядаюць рэальнасці. Аднак менавіта з прац гэтых гісторыкаў пачалося вывучэнне эканомікі Беларусі ў XVI—XVII ст. у цэлым і прыватнаўласніцкага маёнтка ў прыватнасці.

Наступным крокам у вывучэнні стану прыватнаўласніцкага маёнтка ў Беларусі ў другой палове XVI - пачатку XVII ст. можна лічыць працы М.К. Любаўскага[3]. Яго дэфініцыя гаспадарчага двара і маёнтка супярэчыць пoглядам Леантовіча. Так, апроч разумения шляхецкага гаспадарчага двара як адміністрацыйнага і гаспадарчага цэнтра ўладання, ён вызначаў двор як сядзібу, у якую ўваходзілі жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Зыходзячы з гэтага, паняцці «маетность» і «маенток» маюць больш шырокія значэнні. Яны разглядаюцца як адно ці некалькі паселішчаў з іх жыхарамі, якія ўваходзілі ў адну сістэму гаспадарання і належалі аднаму землеўладальніку з цэнтрам - гаспадарчым дваром. Акрамя гэтага, у сваіх нарысах па гісторыі Літоўска-Рускай дзяржавы вучоны разглядаў працэс правядзення аграрных рэформ сярэдзіны XVI ст. у Беларусі. М.К. Любаўскі першы паказаў значэнне ўплыву валочнай памеры ва ўладаннях каралевы Боны на тэрыторыі Пінскага і Клецкага княстваў на далейшы працэс рэарганізацыі сельскай гаспадаркі ў Вялікім княстве Літоўскім.

Вялікую цікавасць маюць працы М.В. Доўнар-Запольскага[4]. Пры дапамозе шматлікіх статыстычных матэрыялаў ён прааналізаваў і вызначыў суадносіны шляхецкіх гаспадарчых двароў і фальваркаў. Даследчык лічыў, што эканамічны росквіт Вялікага княства Літоўскага прыйшоўся на першую палову XVI ст. Далейшае ўвядзенне фальваркава-паншчыннай сістэмы, на думку Доўнар-Запольскага, з'яўлялася памылковым крокам,які прывёў як да збяднення пана, так і да збяднення селяніна, што ў сваю чаргу негатыўна адбілася на агульным эканамічным стане дзяржавы. Але да гэтай высновы М.В. Доўнар-Запольскага можна адносіцца досыць крытычна таму, што ў якасці доказаў для сваіх тэзісаў ён выкарыстоўваў дадзеныя Полацкай рэвізіі 1552 г., а таксама інвентарныя вопісы Бабруйскай воласці і Коб-

рынскага староства. А на гэтых тэрыторыях па шэрагу аб'ектыўных прычын, сярод якіх трэба выдзеліць складанае знешнепалітычнае становішча: падчас Лівонскай вайны частка гэтых тэрыторый стала арэнай ваенных дзеянняў, і геаграфічнае: азначаныя землі не валодалі развітай сеткай гандлёвых шляхоў для экспарту прадукцыі ў заходнееўрапейскія краіны, фальваркава-паншчынная гаспадарка заўсёды знаходзілася на больш нізкім узроўні, чым у іншых рэгіёнах Вялікага княства Літоўскага, напрыклад у Панямонні.

Значную працу па вывучэнні стану эканомікі беларускіх зямель у канцы XVI - пачатку XVII ст. правёў беларускі навуковец У.І. Пічэта[5]. У яго манаграфіі «Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве» ўпершыню зроблены комплексны аналіз працэсу правядзення валочнай памеры, а таксама стану гаспадарчага двара напярэдадні і ў час аграрнай рэформы. Аўтар праводзіць грунтоўнае даследаванне на падставе дадзеных па велікакняжацкіх гаспадарчых дварах. Таму звесткі пра прыватнаўласніцкія маёнткі паступаюць толькі ў кантэксце інфармацыі пра ўладанні вялікага князя. Аднак тэта не змяншае навуковую вартасць зробленага даследавання. У.І. Пічэта прааналізаваў склад гаспадарчых двароў, тэхніку гаспадарання, ступень развіцця земляробства і жывёлагадоўлі, суадносіны прыбыткаў і расходаў, павіннасці сялян, працэсы знікнення чэлядзі нявольнай, юрыдычнае становішча цяглых і асадных сялян. Акрамя гэтага, цікавым з'яўляецца аналіз валочнай памеры ва ўладаннях каралевы Боны як прэлюдыі да правядзення аграрнай рэформы ў маштабах дзяржавы. Праўда, ён злёгку перабольшвае яе значэнне, называючы першай спробай перамеру зямлі на валокі ў Вялікім княстве Літоўскім. Так, першая ў Беларусі валочная памера была праведзена ў 1530 г. Радзівіламі ў Кнышынскай воласці. Крыху пазней у сваей працы «Экономическое развитие Белоруссии и Литвы в XV -XVI вв.», якая ўвайшла ў зборнік яго прац «Белоруссия и Литва XV-XVI вв.», ён працягвае вывучэнне азначанай тэматыкі і засяроджвае сваю ўвагу на становішчы гаспадарчых двароў і працэсе стварэння фальваркаў на тэрыторыі заходніх валасцей Вялікага княства Літоўскага. Аднак зноў жа даследаванне датычыцца пераважна велікакняжацкіх маёнткаў і маёнткаў буйной шляхты, а ўладанні дробнай і сярэдняй шляхты застаюцца недаследаванымі.

Важны уклад у вывучэнне працэсу і вынікаў правядзення аграрнай рэформы сярэдзіны XVI ст. зрабіў вучань У.І. Пічэты К.І. Кернажыцкі[6]. Адным з першых ён правёў комплексны аналіз эканамічнай сітуацыі, якая склалася напрыканцы XVI ст. у межах асобнага канкрэтнага рэгіёна. Пры аналізе ходу і вынікаў валочнай памеры на тэрыторыі Бабруйскага староства ён выкарыстоўваў метад аналізу дадзеных па адных і тых жа ўладаннях за розныя гады. Прамежак часу, выбраны для даследавання, быў таксама досыць вялікі: з канца XVI да першай паловы XIX ст. Гэта дазволіла прааналізаваць не толькі працэс з'яўлення і распаўсюджвання фальваркава-паншчыннай сістэмы, але і далейшую яе эвалюцыю.

Праблему вызначэння прычын і маштабаў эканамічнай адсталасці ўсходніх рэгіёнаў Беларусі, а таксама спецыфіку і асаблівасці сельскагаспадарчага развіцця на гэтых землях Вялікага княства Літоўскага закрануў у сваёй манаграфіі «Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии» В.І. Мялешка[7]. На думку даследчыка, марудныя тэмпы распаўсюджвання фальваркава-паншчыннай гаспадаркі і захаванне старых форм землекарыстання ў азначаных рэгіёнах звязаны з тым, што на ўсходзе Беларусі сялянскі зямельны надзел быў значна большы па плошчы, чым, напрыклад, на захадзе Беларусі. Гэта адбылося таму, што ў выніку шматлікіх войнаў, якія вяліся на ўсходніх тэрыторыях Вялікага княства Літоўскага, шчыльнасць насельніцтва была невысокая. У выніку склалася вялікая плошча сялянскага надзелу. У такіх умовах перамер зямлі на валокі і ўвядзенне фальваркава-паншчыннай гаспадаркі з'яўляліся нерэнтабельнымі. Таму там працягвалі існаваць старыя формы землекарыстання. Гэтым тлумачыцца невялікая колькасць гаспадарчых двароў і фальваркаў на азначанай тэрыторыі.

Першае грунтоўнае даследаванне па крыніцазнаўству аграрнай гісторыі Беларусі належыць З.Ю. Капыскаму[8]. Яго праца пабудавана на аснове матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Шмат увагі ён звяртае на разгляд зместу інвентароў. На падставе дадзеных, змешчаных у інвентарах, ён робіць шэраг цікавых высноў адносна суадносін панскага гаспадарчага двара і фальварка. У прыватнасці, ён высунуў тэзіс наконт таго, што фальварак не з'яўляецца прынцыпова новай з'явай у землекарыстанні. На думку З.Ю. Капыскага, гэта заканамерны вынік эвалюцыі шляхецкага гаспадарчага двара. Безумоўна, інвентарныя дадзеныя як па гаспадарчаму двару, так і па фальварку шмат у чым з'яўляюцца падобнымі. Але нельга забываць і іншы аспект гэтага пытання. Калі шляхецкі гаспадарчы двор быў арыентаваны на самадастатковасць і толькі невялікая частка яго прадукцыі ішла на рынак, то мэтай дзейнасці фальварка ўжо з'яўляецца некаторая спецыялізацыя па пэўнай прадукцыі і арыентацыя на рынак. Таму больш правільна будзе лічыць фальварак прынцыпова новай з'явай у сістэме гаспадарання на землях Вялікага княства Літоўскага.

Становішча прыватнаўласніцкіх сялян на беларускіх землях у XVI—XVII ст., а таксама змест павіннасцей, якія яны выконвалі, закранаюцца ў даследаваннях П.А. Лойкі[9]. Яго манаграфія адзначаецца багатым фактычным матэрыялам. Так, аналіз становішча прыватнаўласніцкіх сялян вядзецца на падставе дадзеных 451 інвентарнага вопісу па 220 уладаннях, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі. Пры гэтым ён робіць выснову, што тып землекарыстання ў прыватнаўласніцкіх маёнтках залежаў у значнай ступені ад індывідуальных асаблівасцей геаграфічнага распалажэння. У прыватнасці, шляхецкія гаспадарчыя двары рэарганізоўваліся ў фальваркі ў выпадку наяўнасці добрай зямлі, знаходжання паблізу вялікіх гандлёвых цэнтраў і шляхоў, а таксама з нагоды іншых фактараў.

Праблемамі сялянскага землеўладання і землекарыстання на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага ў XVI—XVII ст. займаецца В.Ф. Голубеў[10]. На падставе шматлікіх крыніц ён зрабіў высновы адносна недасканаласці панаваўшых да гэтага часу ў гістарычнай навуцы сцвярджэнняў таго, што нармальнае існаванне як гаспадарчага двара, так і фальварка магло быць пабудавана выключна на аснове пастаяннага павелічэння землеўладальнікам аб'ёмаў эксплуатацыі селяніна. Зыходзячы з аналізу прыватнаўласніцкіх, царкоўных і велікакняжацкіх уладанняў, В.Ф. Голубеў сцвярджае, што шмат увагі надавалася і якаснаму паляпшэнню тэхналогіі вытворчасці. Пры гэтым на падставе разгляду стану сялянскага зямельнага надзелу аўтар паказвае, што землеўладальнікі цудоўна разумелі, што нармальнае існаванне маёнтка магчыма толькі пры добрым матэрыяльным становішчы селяніна, таму яны спрыялі развіццю і сялянскай гаспадаркі.

Праблемы існавання прыватнаўласніцкага маёнтка на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага не маглі не прыцягваць увагу і польскіх даследчыкаў. Безумоўна, большай часткай іх працы датычыліся менавіта эканамічнай гісторыі Кароны Польскай. Шмат увагі надаецца вывучэнню сярэднявечнай польскай эканомікі ў агульнаеўрапейскім кантэксце: гандлёвым адносінам, станаўленню новых форм сельскагаспадарчай вытворчасці і іншым пытанням. Пры гэтым польскія навукоўцы ў сваіх працах часта закраналі і пытанні, звязаныя з развіццём прыватнаўласніцкіх маёнткаў на беларускіх землях у другой палове XVI - пачатку XVII ст. Азначаная праблема трапляе ў сферу ўвагі польскіх даследчыкаў яшчэ ў пачатку XX ст. Першым з іх можна адзначыць І. Бараноўскага[11]. У сваіх працах ён разглядае праблему існавання вёскі ў межах фальварка. Пры гэтым аўтар спрабаваў вызначыць дакладную дэфініцыю фальварка, а таксама механізмы яго функцыяніравання.

Увогуле, пытанне вызначэння мяжы паміж шляхецкім гаспадарчым дваром і фальваркам займала значнае месца ў польскай гістарыяграфіі. Так, Ян Руткоўскі[12] лічыць, што існавала і своеасаблівая пераходная ступень паміж гаспадарчым дваром і фальваркам. У сваёй працы аўтар дае ей цікавае абазначэнне «folwarczek». На думку даследчыка, гэта даволі невя-

лікая па сваіх памерах (1-2 ланы*) гаспадарка, якая па большасці сваіх параметраў адпавядала менавіта шляхецкаму гаспадарчаму двару, але разам з тым істотна ад яго адрознівалася сваёй накіраванасцю на вытворчасць і продаж збожжа. Таму Ян Руткоўскі лічыць, што мэтазгодна выдзеліць падобныя гаспадаркі ў асобную своеасаблівую трупу. Акрамя гэтага, у яго даследаваннях шмат увагі надаецца вывучэнню механізмаў рэарганізацыі панскіх гаспадарчых двароў у фальваркі.

У працах Аліны Ваўжыньчык[13] закранаецца ступень развіцця сельскай гаспадаркі на тэрыторыі Берасцейскага ваяводства. Надзвычай цікавымі ў яе даследаваннях з'яўляюцца спробы вызначэння рэнтабельнасці каралеўскіх уладанняў на тэрыторыі Падляшша і Мазовіі. Пры гэтым яна распрацавала сістэму крытэрыяў, паводле якой і вызначала ступень эфектыўнасці вядзення гаспадаркі ў тым ці іншым маёнтку.

Праблема сярэднявечнай прыватнаўласніцкай гаспадаркі закранаецца і ў працах Ежы Тапольскага[14]. Шэраг яго даследаванняў прысвечаны тэарэтычнаму і практычнаму абгрунтаванню з'яўлення і развіцця фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання ў краінах Усходняй Еўропы. Пры гэтым у яго працах праводзіцца грунтоўны аналіз як сярэднявечнай гаспадаркі Рэчы Паспалітай, так і агульнаеўрапейскай. Ён дае цікавую мадэль з'яўлення і пашырэння фальваркавых гаспадарак на ўсходнееўрапейскіх землях. Напачатку адбываецца працэс зніжэння прыбыткаў шляхты з-за недасканалай сістэмы землекарыстання. Гэта ў сваю чаргу стымулюе пошук шляхтай новых форм гаспадарання з павышанай эфектыўнасцю. Адбываецца рост эканамічнай актыўнасці шляхты. Усе працэсы праходзяць на фоне збожжавай гарачкі ў краінах Заходняй Еўропы. Экспарт збожжа становіцца надзвычай выгадным, аднак стварэнне фальваркаў - гаспадарак, дзейнасць якіх грунтавалася на выкарыстанні паншчыннай працы цяглых сялян, было немагчыма без змянення прававой базы ўзаемаадносін паміж сялянамі і шляхтай у бок далейшага запрыгоньвання. У той жа час вялікі князь сам з'яўляўся галоўным землеўладальнікам у дзяржаве. І ён таксама хацеў павышэння прыбыткаў са сваей маёмасці. Таму ён праводзіць палітыку, накіраваную на рэфармаванне сістэмы гаспадарання за кошт большага запрыгоньвання сялян. У выніку стварэнне фальваркаў становіцца больш зручным, чым і скарысталіся прадстаўнікі шляхты, ствараючы іх у сваіх уладаннях.

Варта адзначыць, што Ежы Тапольскі ў сваіх працах праводзіць дыферэнцыяцыю фальваркаў на аўтаномныя і экспансіяніслцкія. Аўтаномнымі ён абазначае фальваркі, прадукцыя якіх накіроўвалася на ўнутраны рынак. Адпаведна экспансіяніслцкі фальварак быў з'арыентаваны на замежны рынак, грунтуючы сваю дзейнасць пераважна на экспарце збожжа. Відавочна, што экспансіяніслцкі фальварак, які ставіў на першы план вытворчасць збожжа, імкнуўся да павелічэння прыбытковасці як шляхам развіцця збожжавай агракультуры, так і шляхам узмацнення эксплуатацыі цяглых сялян. Аўтаномны фальварак быў вымушаны накіроўваць на ўнутраны рынак большы асартымент прадукцыі, у тым ліку і прадукцыю рамеснікаў, што рабіла яго ўплыў на сялянскую гаспадарку значна меншым, чым у фальварку, уся дзейнасць якога была сканцэнтравана вакол вытворчасці і транспарціроўкі збожжа. Зыходзячы з гэтай канцэпцыі, на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага пераважалі менавіта аўтаномныя фальваркі. Гэта было абумоўлена складанасцямі дастаўкі прадукцыі на замежны рынак.

Марыя Барбара Тапольска[15] ў сваіх працах закранае пытанні эканамічнага развіцця і асаблівасцей усталявання фальваркава-паншчыннай сістэмы ва ўсходніх частках Вялікага княства Літоўскага. На падставе архіўных

---

Лан (лац. Laneus, ням. Lehen) - сярэднявечная еўрапейская адзінка вымярэння зямлі. Франконскі лан быў прыблізна роўны 23 га, холмскі - 16,8, тэўтонскі лан - 25 га. Ян Руткоўскі, відавочна, мае на ўвазе старапольскі (каралеўскі) лан, які вядомы ў Кароне Польскай з XVI ст. і быў роўны 48 га. У Вялікім княстве Літоўскім лан атрымаў распаўсюджванне пад назвай «валока».

матэрыялаў па Шклоўскім старостве яна зрабіла шэраг высноў аб запаволеным развіцці новых форм землекарыстання ва ўсходніх рэгіёнах. У выяўленні прычын гэтых з'яў яна, як і В.І. Мялешка, прыходзіць да высновы, што старыя формы землекарыстання ў азначаных рэгіёнах былі больш рэнтабельныя таму, што ў выніку шматлікіх памежных войн з Маскоўскай дзяржавай шчыльнасць насельніцтва была невысокай і адпаведна плошча зямельнага надзелу была большая, чым на іншых тэрыторыях Вялікага княства Літоўскага.

Праблемы сярэднявечнай эканомікі Вялікага княства Літоўскага закраналіся і ў працах украінскіх гісторыкаў. Апрача аналізу форм землеўладання і землекарыстання на ўкраінскіх землях, шмат увагі яны надаюць даследаванню аб'ёмаў экспарту збожжа і далейшаму ўплыву на развіццё сельскай гаспадаркі. Таксама значнае месца займаюць даследаванні, прысвечаныя развіццю промыслаў і вытворчасці на Украіне. Што датычыцца вывучэння прыватнаўласніцкіх маёнткаў, то першым можна выдзеліць М.С. Грушэўскага[16], які яшчэ ў 1907 г. на прыкладзе ўкраінскіх рэгіёнаў княства правёў аналіз механізмаў функцыяніравання панскіх гаспадарчых двароў. Шмат увагі ў яго працы надаецца вызначэнню крыніц прыбыткаў землеўладальнікаў, а таксама аналізу праяўленняў тэндэнцый да запрыгоньвання сялян у Літоўскіх Статутах.

З сучасных украінскіх гісторыкаў вылучаюцца працы Ірыны Варанчук[17], якая разглядае пытанні стану шляхецкіх маёнткаў на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, у прыватнасці даследуе стан слуг у панскіх гаспадарчых дварах. Акрамя грунтоўнага аналізу павіннасцей гэтай часткі сялян, яна закранае і працэсы фарміравання агульнай арганізацыі і прынцыпаў функцыяніравання панскага гаспадарчага двара на тэрыторыі Валынскіх зямель.

Варта адзначыць, што ў апошнія гады Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі была распачата праца над даследаваннем гісторыі сялянства Беларусі ад старажытнасці і да нашых часоў. Праблема развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі другой паловы XVI - пачатку XVII ст. закранаецца ў першым томе Гісторыі сялянства Беларусі[18]. Каштоўнасць гэтай працы заключаецца ў тым, што на падставе шырокай гістарыяграфічнай базы і вялікай колькасці крыніц у ёй разглядаецца эвалюцыя сялянскай гаспадаркі, землеўладання і землекарыстання, павіннаснага абцяжарання, запрыгоньвання, рыначных сувязей сельскіх вытворцаў.

Таксама шэраг пытанняў па азначанай тэме разглядаецца ў Энцыклапедыі гісторыі Беларусі[19]. У прыватнасці, шмат увагі ў гэтым выданні нададзена асноўным паняццям, якія сустракаюцца пры аналізе прыватнаўласніцкага маёнтка на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага ў азначаны перыяд.

Такім чынам, даследаваннем прыватнаўласніцкага маёнтка на беларускіх землях займаліся многія беларускія, польскія і ўкраінскія вучоныя. Разам з тым некаторыя аспекты названай праблемы да гэтага часу засталіся па-за межамі ўвагі навукоўцаў. Так, неабходна глыбока і ўсебакова прааналізаваць працэсы станаўлення паншчыннага тыпу гаспадарання, прыватнаўласніцкія фальваркавыя гаспадаркі, асноўныя прынцыпы іх дзейнасці, ступень рэнтабельнасці фальваркаў у Беларусі.

[1]Гл.: Владимирский-Буданов М.Ф. Крестьянское землевладение в Западной России до половины XVI в. Киев, 1892; Ён жа. Имения Литовского государства. Киев, 1889.

[2]Гл.: Леонтович Ф.И. Крестьяне юго-западной России по литовскому праву XV и XVI столетий. Киев, 1863; Ён жа. Крестьянский двор в Литовско-Русском государстве. СПб., 1897.

[3]Гл.: Любавский М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. М., 1910; Ён жа. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута. М., 1892.

[4]Гл.: Довнар-Запольский М.В. Западнорусская сельская община в XVI в. СПб., 1897; Ён жа. Очерки по организации западнорусского крестьянства в XVI в. Киев, 1905; Ён ж а .Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах. Киев, 1901.

[5]Гл.: Пичета В. И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. М., 1958; Ён жа . Белоруссия и Литва XV-XVI вв. М., 1961.

[6]Гл.: Кернажыцкі К.І. Аграрная реформа ў Бабруйскім старостве і эканамічнае становішча яго насельніцтва з XVII да паловы XIX ст. Мн., 1931.

[7]Гл.: Мелешко В.И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. Мн., 1978.

[8]Гл.: Копысский З.Ю. Источниковедение аграрной истории Белоруссии. Мн., 1978.

[9]Гл.: Л о й к а П . А. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI -XVIII ст. Мн., 1991.

[10]Гл.: Голубеў В.Ф. Сялянскае землеўладанне І земпекарыстанне на Беларусі XVI - XVIII стст. Мн., 1992.

[11]Гл.: В а га п о ws k i I. Wies I folwark // Studia z dziejow agrarnych Polski. Warszawa, 1914.

[12]Гл.: Rutkowski J . Co to byly folwarki w dawniej Polsce? // Roczniki dziejow spolecznych I gospodarczych. 1951. Т. 3; Ён жа. Wies europejska poznego feudalizmu (XVI-XVIII) / Pod red. J. Topolskiego. Warszawa, 1986.

[13]Гл.: Wawrzynczyk A. Rozwoj wielkiej wlasnosci na Podlasiu w XV-XVI wieku. Wroclaw, 1951.

[14]Гл.: Topolski J. Przelom gospodarczy w Polsce XVI wieku i jego nastempstwa. Poznan, 2000; Ё н ж а. Narodziny kapitalizmu w Europie XIV-XVII wieku. Poznan, 2003.

[15]Гл.: Topolska M . B . Dobra Szklowskie na Bialorusi Wschodniej w XVII-XVIII wieku. Warszawa, 1969.

[16]Гл.: Грушевський М. Історія Украінй-Руси. КиТв, 1995. Т. 6.

[17]Гл.: Ворончук І. Шляхетьский двір, йога слугі та челядь // Соціум. Альманах соціальноі історіі. 2004. Вип. 4. С. 117-133.

[18] Гл.: Гісторыя сялянства Беларусі. Ад старажытнасці да 1861 г. Мн., 1997. Т. 1

[19] Гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі / Пад рэд. Г.П. Пашкова. Мн., 1993-2002.

Паступіў у рэдакцыю 27.12.06.

***Леанід Юр'евіч Казакоў*** - аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік - кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу А.Г. Каханоўскі.